# КАРАГОДНАЯ ЛЯЛЬКА "АРЫША"



**Аўтар: Сапунова Наталля Іванаўна, выхавальнік дашкольнай адукацыі ДУА «Яслі-сад №113 г. Магілёва»**

**Для дзяцей 4-5 год**

**Мэта:** развіваць памяць, кемлівасць, увагу; выпрацоўваць каардынацыю рухаў.

**Матэрыял:** лялька Арыша

**Гульнёвыя дзеянні:** дзеці становяцца ў круг, выхавальнік з лялькай Арышай усярэдзіне. Пасля слоў дзяцей, "Арыша" хапае каго-небудзь з круга і спрабуе адгадаць, хто яе паклікаў. Калі яна адгадае імя дзіцяці, той становіцца "Арышай", калі не – працягвае лавіць дзяцей і адгадваць іх імёны.

**ХОД ГУЛЬНІ**

Усе дзеці становяцца ў круг, пасярэдзіне знаходзіцца выхавальнік з лялькай Арышай (адзін з дзяцей) з завязанымі вачыма. Дзеці ходзяць у карагодзе вакол яе і прыгаворваюць:

Арыша, ты пацеха наша!
Ручкі з золата, ножкі з золата,
Валасы кудлатыя, а вочы зыркатыя.

“Арыша” хапае каго-небудзь з карагода і спрабуе адгадаць, хто гэта. Калі адгадае, той становіцца “Арышай”, калі не – гульня працягваецца далей.

Гульня паўтараецца 4-5 разоў.

**Дыдактычная гульня “Што гэта за рэчы?”**

**Для дзяцей 5-7 год**

**Мэта:** пазнаёміць з беларускім нацыянальным касцюмам, арнаментам; пашыраць і актывізаваць слоўнік па тэме “Адзенне”.

**Дыдактычны матэрыял:** лялька Арыша ў нацыянальным касцюме, фланелеграф, малюнкі і ілюстрацыі.

**Гульнёвыя дзеянні:** разгледзіць малюнкі і ілюстрацыі з выявай адзення, назваць гэту рэч і яе колер (белая, блакітная і г.д.). Разгледзіць вопратку на ляльцы, арнамент, выявіць элементы арнаменту, колер, дзе ён на вопратцы сустракаецца.

**ХОД ГУЛЬНІ**

Выхавальнік звяртае ўвагу дзяцей на фланелеграф, на якім размешчаны элементы беларускага нацыянальнага касцюма.

– Што гэта за рэчы? *(Спадніца, кофта, сукенка, кашуля, штаны.)*

– Якога колеру сукенка, кашуля? *(Белага колеру.)*

– А штаны і спадніца? *(Зялёнага, карычневага.)*

– Белы колер вопраткі азначае чысціню, дабрыню; чырвоны – цеплыню, хараство, весялосць; зялёны – любоў да роднай зямлі.

– Паглядзіце уважліва і адкажыце, чым аздоблена вопратка. *(Узорамі.)*

– Якія ўзоры вы бачыце? *(Ромбы, стужкі, крывыя лініі, крыжыкі, квадраты.)*

– Якога колеру ўзоры на кашулі, сукенцы, кофце? *(Чырвонага.)*

– Якога колеру стужкі на спадні́чках? *(Зялёнага, чырвонага, блакітнага і г.д.)*

– Гэтыя прыгожыя стужкі называюць арнаметам. Давайце скажам разам – “арнамент”. *(Харавыя і індывідуальныя адказы дзяцей.)*

– Якое адзенне носяць дзяўчаткі? *(Кофты, сукенкі, спадніцы.)*

– А хлопчыкі? *(Штаны, кашулі, камізэлькі.)*

– А ці носім мы такую вопратку зараз? Так, мы апранаемся ў сучасную вопратку, а такое адзенне насілі ў даўнейшыя часы нашы продкі. Таму яно так і называецца – “беларускі нацыянальны касцюм”.

Выхавальнік паказвае ляльку Арышу. Дзеці вітаюцца з ёю.

– Паглядзіце на Арышу. У што яна апранута? *(У беларускі нацыянальны касцюм.)*

– Якога колеру кофта*? (Белага.)*

– Якім узорам яна аздоблена? *(Адказы.)*

– Якога колеру спаднічка? Дзе на ёй нашытыя стужкі? (*Унізе, на рукавах.)*

– Якога колеру стужкі?

– Што на галаве ў Арышы? *(Намітка.)*

– Што на нагах? *(Чаравікі.)*

– Хто жадае расказаць пра касцюм Арышы?

Выхавальнік прапануе дзецям скласці невялікае апавяданне.

## <u>Дыдактычная гульня “Скажы наадварот”</u>

**<u>Для дзяцей 5-7 год</u>**

**Мэта:** развіццё умення падбіраць словы з процілеглым значэннем.

**Дыдактычны матэрыял:** лялька Арыша.

**Гульнёвыя дзеянні:** лялька Арыша пачынае сказ, а выхаванец дапоўняе сказ словам з процілеглым значэннем.

### ХОД ГУЛЬНІ

– Арыша пачынае сказ, а да каго яна звяртаецца, той адказвае наадварот. Напрыклад: “У Тані рукі чыстыя, а у Толі – брудныя”.

– У зайца вушы вялікія, а ў кошкі – … (маленькія).

– У Бураціна нос доўгі, а ў дзетак – … (кароткі).

– У слана вочы вялікія, а ў мышкі – … (маленькія).

– Рака шырокая, а ручэй … (вузкі).

– Мой тата высокі , а я … (нізкі).

– Ноччу цёмна, а днём … (светла) і г.д.

Лялька Арыша дзякуе дзецям за гульню і развітваецца.